# АДМЕТНАЯ СКОКАЎСКАЯ СПАДЧЫНА НЯМЦЭВІЧАЎ

**А.А.Гладышчук**

**Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт, г. Брэст, Беларусь**

Добра вядома, што Скокамі каля Брэста больш за 200 гадоў валодалі Нямцэвічы, якія з'явіліся тут у другой палове XVII стагоддзя: стольнік Віцебскі і стараста Гнеўчыцкі Андрэй Нямцэвіч купіў вёскі Нэплі на Бугу і Клейнікі на Лясной. Свой радавод Нямцэвічы вядуць з другой паловы XV стагоддзя, але сваёй знакамітасцю яны абавязаны Юльяну Урсыну Нямцэвічу – пісьменніку, паэту, публіцысту, ад'ютанту Тадэвуша Касцюшкі, аднаму з аўтараў першай Канстытуцыі ў Еўропе, актыўнаму ўдзельніку паўстання 1794 года, які нарадзіўся і вырас у Скоках.

Скокаўскі палац у наваколлі Брэста, як гэта ні крыўдна гучыць сёння для тысячагадовага горада, ёсць адзіны ацалеўшы гістарычны палац, за якім паўстае цень Марцэля, падчашага Мельніцкага, бацькі Юльяна Урсын Нямцэвіча, які ў другой палове XVIII стагоддзя надумаў перабрацца са сціплага шляхецкага дворыка ў мураваны палац. Падстаў для здзяйснення такой сур'ёзнай справы было некалькі. Па-першае, сям'я, нягледзячы на вялікую смяротнасць дзяцей, значна павялічвалася. Акрамя чатырох дарослых дачок Тэклі, Антаніны, Казіміры і Бенядзікты, патрэбна было думаць аб будучым сыноў: Юльяна, Яна і Каэтана. Праўда, у далейшым старэйшы Юльян з гэтай абоймы выпаў, таму што не пагадзіўся з намерамі бацькі ажаніць яго з багатай дзяўчынай. Па-другое, месца ля гасцінца на Матыкалы не давала здзейсніць Марцэлю сваю мару: пабудаваць касцёл з фамільнай крыптай. Трэба меркаваць, што былі і нейкія другія падставы, таму што выбраная пляцоўка для будаўніцтва ладна прымыкала да сакавітых лугоў ля ракі Лясной і змыкалася з самой вёскай Скокі. Як бы там ні было, але ў 1770 годзе Скокаўскі палац невядомым архітэктарам быў збудаваны. Пазней у 1796 годзе Марцэль закончыў будаваць і жаданны касцёл з крыптай насупраць палаца.

Канцэпцыя Марцэля пры будаўніцтве зыходзіла з таго, што яго два сыны Ян і Каэтан будуць жыць у ім з сем'ямі. Адсюль строгая люстэркавая сіметрыя планіроўкі палацу, дзе цэнтральнае месца было адведзена вестыбюлю і вялікай зале з выхадам у парк. Зала на другім паверсе прызначалася для розных святкаванняў, таму мела антрэсоль для музыкантаў; па баках залы знаходзіліся дзве гасцёўні. Вялікая колькасць другіх малых скляпенных пакояў патрэбна была, па задумцы Марцэля, для неабходнага падзелу паміж сем'ямі.

Але гэтага не здарылася, таму што згодна тэстаменту бацькі Скокі адышлі да Яна, а Каэтан спачатку жыў у Старым Сяле (суседняя вёска). А затым перабраўся ў Клейнікі ў дзедаўскі дом. Да сённяшняга часу ў палацы захаваўся на другім паверсе пакой, які называўся «скарбніцай» і ў якім да першай сусветнай вайны захоўваўся радзінны архіў Нямцэвічаў і другія рэчы, якія мелі фактычна дзяржаўную каштоўнасць. Як успамінае апошні ўладар палаца Станіслаў У.Н., «скарбніца» была сведкам апошняга натуральнага падзелу паміж братамі Янам і Каэтанам, падчас якой грошы і каштоўнасці проста высыпаліся на падлогу і дзяліліся паміж братамі. Гэты невялікі пакой, са скляпеністай столлю, прымыкае да аднаго з салонаў другога паверху і захаваўся ў сваім першародным стане да нашага часу. У захаваным пакоі з зорнай столлю за снедальнай залай на першым паверсе звычайна меў начлег Тадэвуш Касцюшка, які меў далёкую сваяцкасць да Нямцэвічаў.

Двухпавярховы палац у Скоках меў спачатку на флангах дзве вежы – алькежы, якія былі характэрнымі для стылю позняга барока. Але пазней унук Марцэля Тадэвуш (1793-1839), да якога перайшоў паслядоўна палац, алькежы зраўняў з дахам, таму яны не захаваліся. Тадэвуш, які быў маршалкам шляхты Берасцейскага павета, нагадаў

таксама зрабіць унутраную перабудову з мэтай павелічэння памеру пакояў, большая частка якіх згубіла тады сваю першародную столь, таму што ў той час уваходзіла ў моду плоская. Але, як нагадвае Станіслаў У. Н., у пяці пакоях столь захавала свой першародны выгляд, што магчыма ўбачыць і сёння.

Марцэль свой палац будаваў на многія стагоддзі, і гэта спраўдзілася. Так, таўшчыня мураваных сцен партэра (першага паверха) – больш як за метр. Сам палац стаіць на моцнай каменнай падушцы, якая распласталася пад усім будынкам і падпіраецца ў сутарэнні цэнтральнай каменнай калонай. Сутарэнне агульнай вялікай залай распасціраецца пад усім будынкам і столь яго мае зорачны выгляд, які робіць уражанне старой рыцарскай залы... Для чаго аб гэтым пішу? Дык вось, зусім трэба быць без галавы, каб такому цудоўнаму, яшчэ не разбуранаму палацу не знайсці справы, не вярнуць яму веліч сваёй гістарычнасці. Вядомы наш зямляк Напалеон Орда паміж 1861 і 1877 гадамі, калі ўжо ў палацы гаспадарыў наступны з Нямцэвічаў – Ян Тытус, зрабіў свой цудоўны малюнак, які дае выснову для аднаўлення палаца. Цікава пры гэтым заўважыць, што малюнак Скокаўскага палаца быў зроблены тады не адзіны і захаваўся таксама яго варыянт у прыватнай калекцыі з белымі скакунамі ангельскай пароды на першым плане.

Апошні ўладар палаца ў Скоках Станіслаў У.Нямцэвіч (1897-1979) у сваіх успамінах «Маім унукам» прыводзіць цікавыя, дагэтуль невядомыя звесткі аб дэталях унутранага ўбрання палаца перад першай сусветнай вайной. Так, у парадный зале на першым паверсе з выхадам у парк вісеў партрэт Самуэла Казіміра Нямцэвіча (1600-?) – стольніка Велькамерскага, які стаіць у даспехах на каленях перад крыжам з малітвай у час шведскай напасці (гэта яго сын Андрэй (1640-?) стаў уладальнікам вёсак Нэплі і Клейнікі пад Бярэсцем). У зале знаходзіліся і другія партрэты: Андрэя Нямцэвіча у чырвоным кантушы, Марцэля (1727-?) – бацькі Юльяна і будаўніка палаца ў Скоках, Станіслава ў генеральскім мундзіры – гродзенскага губернатара, роднага пляменніка Марцэля, Юльяна У.Нямцэвіча – нашага знакамітага земляка, яго брата Яна, Ядвігі з Сухадольскіх – маткі Юльяна і гэтак далей. Салоны партэра мелі цудоўны паркет. Гэта неверагодна, але паркет з таго часу, праўда, сапсаваны пазнейшым пакрыццём, застаўся і мае шанс пры пэўных адносінах быць адноўленым. У салонах знаходзіліся таксама малюнкі вядомых майстроў таго часу, як, напрыклад, Ф. Барталамео «Маці Божая з Ісусам у ружах», ван Дэйка, Тэнэрса і, як гэта ні неверагодна, нават эскізы Леанарда да Вінчы і другіх. Акрамя таго, у зале было шмат рэчаў з крышталю, абрамленых у срэбра і старую бронзу. Натуральна, узнікае пытанне, куды падзеліся ўсе гэтыя і іншыя каштоўнасці Скокаўскага палаца?

Як вядома, ў жніўні 1915 года згодна з указам расійскага імператара нашу мясцовасць павінны былі пакінуць усе яе жыхары. Гэта неверагодна катастрафічная старонка гісторыі нашага краю, аб чым рэдка ўспамінаюць. Дык вось, Скокаўскі палац, як і многія будынкі ў горадзе і крэпасці, падлягаў знішчэнню. Выратавала ад разбурэння Скокаўскі палац у 1915 годзе Зоф'я Мазарака, жонка Яна У.Нямцэвіча (1889-1933), які пазней быў першым прэзідэнтам Брэста. Менавіта пры ім у 20-30-х гадах мінулага стагоддзя ў Брэсце быў пабудаваны цэлы шэраг будынкаў, якія служаць гораду і ў наш час. Калі ўжо немцы былі ў крэпасці, жонка Яна Зоф'я здолела ў камандзіра казацкай дывізіі атрымаць «слово чести», што іх палац у Скоках не будзе ўзарваны. Гэта вельмі цікавы выпадак, калі «слово чести» аднаго чалавека выратоўвае ад знішчэння гістарычны аб'ект, а маўчанне другіх альбо проста абыякавасць губіць усю справу. Фантастычны прыклад!

Нязнішчаны будынак у Скоках падчас першай сусветнай вайны аблюбаваў пад сваю рэзідэнцыю баварскі прынц Леапольд, які быў камандуючым Усходнім фронтам. Як вынікае з мемуараў міністра замежных спраў Аўстра-Венгрыі, графа Оттакара Чэрніна, які прымаў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і падпісанні Брэсцкага міру, «маленькі замак» у Скоках быў часта месцам неафіцыйных сустрэч розных афіцыйных

асоб, якія ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы гэтага дакумента. Гэта так, як і тое, што калі баварскі прынц у выніку вядомых падзей у 1918 годзе Скокаўскі палац пакінуў, то апошні быў цалкам абрабаваны немцамі, таму што другіх людзей у той час тут проста не было. Вось такі атрымоўваецца незвычайны вынік. Не патрэбна быць вялікім даследчыкам, каб не разумець, што пры прынцу служылі людзі адукаваныя і добра ведалі, што чаго каштуе. Вынік, натуральна, не адназначны, але ён падштурхоўвае да другой ідэі. Раз так, то ёсць шанец, што нейкія рарытэты, асабліва з рэчаў Юльяна У.Нямцэвіча і з яго бібліятэкі, маглі не страціцца, а знаходзяцца дзесьці у прыватнай калекцыі альбо ў нашчадкаў тых афіцэраў, якія маглі ў той час знаходзіцца ў Скоках, а можа дзесьці проста без усялякай там патрэбы пыляцца. Ёсць на гэты конт і другія меркаванні, але патрабуецца час для іх вызначэння.

Справа ў тым, што напярэдадні 1914 года ў Скокаўскім палацы пабываў нямецкі даследчык Аляксандр Краўсхар, які працаваў у бібліятэцы і фамільным архіве Нямцэвічаў, што дало яму магчымасць зрабіць пералік і апісанне рэчаў, маючых прамое дачыненне да нашага земляка. Асабліва яго цікавілі аўтографы, якія пралівалі святло на адносіны Юльяна У.Нямцэвіча са знакамітымі асобамі яго часу. Гэты спіс у А.Краўсхара мае больш чым за трыццаць пунктаў: гэта і Талейран, і прадстаўнікі родаў Сапегаў і Чартарыйскіх, і многія другія. Але асаблівую цікавасць мае ліст ад Джорджа Вашынгтона, напісаны ім да Юльяна У. Нямцэвіча 18.06.1798 г. Даследчык называе таксама каштоўную калекцыю табакерак, якія атрымаў Юльян У.Н. ад цара Паўла I, Напалеона Банапарта, Джорджа Вашынгтона, Томаса Джэферсана і ад знакамітага польскага і рускага мастака Аляксандра Арлоўскага з відарысамі Парыжа і многае другое. Натуральна, гэта ўсё прадстаўляе сёння дзяржаўную каштоўнасць. Можна разважаць аб гэтай справе, якая з'яўляецца зусім не ўласнай, з рознага падыходу, але Скокі сёння не каля Парыжа і не каля Варшавы, а ў Беларусі каля Брэста. А гэта азначае, што і Скокаўскі палац, і ўсё, што тычыцца яго гісторыі, ёсць наша агульная дзяржаўная справа.

Марцэль Нямцэвіч, бацька Юльяна, быў вельмі набожным, што падштурхоўвала яго на ўзвядзенне культавых збудаванняў. Адно знайшло месца каля Скокаў, дзе стаяў драўляны з лістоўніцы дворык, у якім нарадзіўся і вырас знакаміты Юльян Урсын Нямцэвіч. Цагляная калона, што стаіць на прыкметным узвышшы паміж вёскамі Скокі і Матыкалы ў ваколіцах Брэста і аб якой пойдзе гаворка далей у артыкуле, даўно інтрыгавала людзей дапытлівых. Таму і аўтар, які жыве ў Скоках, мае цалкам зразумелую цікавасць да гэтай гістарычнай спадчыны. Спробы знайсці адказ на пытанне, для чаго ўзведзена цагляная калона каля Скокаў, рабілі і другія аўтары, але свае разважанні яны нічым не абгрунтоўвалі. Меркаванне, што цагляную калону маглі ўзвесці ў гонар Канстытуцыі 1791 года федэратыўнай дзяржавы Рэчы Паспалітай, да якой меў прамое дачыненне наш знакаміты зямляк Юльян Урсын Нямцэвіч, маюць сваю лагічнасць, але не прыводзіцца пры гэтым ніякіх пісьмовых крыніц, якія маглі б гэтую думку абгрунтаваць. Да таго ж, як вядома, Канстытуцыя 3 мая 1791 года дзейнічала зусім нядоўга, таму што Рэч Паспалітая, як дзяржава, хутка перастала існаваць. Ды і «свежы» Канстытуцыйны слуп не мог не пярэчыць палітыцы Расіі і меў малы шанец устаяць. Гэтыя разважанні наводзяць на думку, што цагляная калона была ўзведзена значна раней і з іншай нагоды.

Дык вось, мясціна, аб якой ідзе гаворка, у мясцовых жыхароў мае сваё гістарычна ўстойлівае імя **«Рахвал»**. Аднак ніхто не мог растлумачыць сэнс гэтай рэдкай назвы мясцовасці, а пошукі ў літаратурных крыніцах не мелі поспеху. Другое сумненне, што з гэтай назвай мясцовасці не так усё проста, падаў мясцовы жыхар, які калісьці вучыўся ў прыватнай гімназіі імя Ю.Нямцэвіча ў Брэсце, Марк Маркавіч Мартынюк. Мой субяседнік заўважыў, што са слоў яго бабулі, калоне той "на Рахвале" ад вайны з Напалеонам да яе часу (перад другой сусветнай вайной) столькі ж

гадоў, як і назад адкруціць, а можа і больш таго. Сціплая фраза прынцыпова мяняла напрамак пошукаў.

У міжнароднай канферэнцыі па Ю.У. Нямцэвічу ў Брэсце ў 2001 годзе прымалі ўдзел нашчадкі Нямцэвічаў. У іх ліку была прыехаўшая з Францыі Тэрэса Вярыха з Урсын Нямцевічаў, якая нарадзілася ў Скокаўскім палацы ў 1925 годзе. Яна прывезла з сабой на кампутарнай дыскетце ўспаміны свайго бацькі Станіслава Урсын Нямцэвіча, апошняга ўладара з Нямцэвічаў Скокаўскім маёнткам, які пакінуў Скокі задоўга да падзей 1939 года і падаўся да Францыі. Як піша ён у сваіх успамінах «Маім унукам», «Марцэль, падчашы Мельніцкі, быў для свайго часу выдатна адукаваным шляхцічам, меў вялікі інтарэс да спраў дзяржавы і гісторыі краю. Вёў пошукі ў старых архівах і нават перапісваў гісторыю свайго ваяводства». Дарэчы, Юльян, яго старэйшы сын, пазней напіша, што сваёй цікавасцю да гісторыі і спраў дзяржаўных, якія праявіліся яшчэ ў дзяцінстве, ён абавязаны бацьку. Дык вось, на пятай старонцы ўспамінаў Станіслава У.Нямцэвіча, якія датычаць бацькі Юльяна – Марцэля, ёсць такі тэкст (прыводзім яго даслоўна на польскай мове): *«...Odziedziczywszy po ojcu znaczne dobra, a w tym i Skoki, z biegiem czasu znacznie owe dobra pomnożył. On to zbudował około 1770 roku pałac skokowski i dokończył kościół w 1796 roky. Odziedziczony po ojcu dworek modrzewiowy skokowski, w którym urodził się Julian, stał w innym zupełnie miejscu, niedaleko obecnego toru kolejowego, przy gościńcu do gminy Motykały, dotykał też do starego dębowego lasu. Cреść tego ostatniego przerobił Marceli na rodzaj parku; wzdłuż gościńca ustawił liczne, naturalnej wielkości drewniane figury «światków», które nocą straszyły konie podróżnych. Stąd liczne procesy z tymi ostatnimi, które słono kosztowały.* ***On też postawił na wysokim słupie posąg św. Rafała, który stał niedaleko dworku i z którego słup pozostał bez posągu do czasów ostatnich...»***

У перакладзе гэта гучыць так: *«Атрымаўшы ў спадчыну ад бацькі значнае багацце, у тым ліку і Скокі, на працягу некаторага часу шматразова яго прымножыў. Гэта ён* [Марцэль Урсын Нямцэвіч, аўт.] *пабудаваў каля 1770 года Скокаўскі палац і завяршыў будаўніцтва касцёла ў 1796 годзе. Атрыманы ў спадчыну ад бацькі скокаўскі дворык з лістоўніцы, у якім нарадзіўся Юльян, знаходзіўся зусім у другім месцы, непадалёку ад існуючай цяпер чыгункі, каля гасцінца, што вядзе да гміны Матыкалы, і прымыкаў таксама да старога дубовага лесу. Частку таго апошняга Марцэль перарабіў па тыпу парку; уздоўж гасцінца ўстанавіў шматлікія, натуральнай велічыні драўляныя фігуры «святкаў», якія ноччу палохалі падарожнікаў. Адгэтуль шматлікія цяжбы з тымі апошнімі, якія каштавалі слана. Ён таксама паставіў на высокай калоне статую святога Рафала, якая стаяла непадалёку ад дворыка і ад якой да апошняга часу засталася калона без статуі...»*

Адсюль вынікае наступнае пытанне: а дзе ж стаяў той бацькоўскі невялікі дворык? Ёсць і напрамак пошукаў: стары гасцінец да Матыкалаў, адбіткі якога яшчэ праглядваюцца на мясцовасці. Кожны, хто бываў у ваколіцах Скокаў, не мог не заўважыць на ўзвышшы паміж Скокамі і Матыкаламі, адкуль у ясны дзень адкрываецца агульная панарама нашага сучаснага Брэста, прыкметную цагляную калону вышынёй метраў каля сямі.. У народзе існуюць розныя меркаванні наконт яе паходжання, але мясціна, дзе яна стаіць, не выклікае сумненняў - гэта Рахвал. Той, хто вырас у нашых мясцінах, добра ведае, што ў мясцовых дыялектах гук «Ф» часта вымаўляюць як «Хв», адсюль не Рафал, а Рахвал. Такім чынам, круг замкнуўся: цагляная калона, на якую Марцэль узнёс святога Рафала каля 250 гадоў назад, дала гістарычную назву мясцовасці, і яна, гэтая калона, захавалася да сённяшняга часу.

Звернемся яшчэ раз да ўспамінаў, дзе Станіслаў У.Нямцэвіч зусім у другім месцы на старонцы трыццаць восьмай свайго рукапісу паўторна робіць важнае ўдакладненне: *«...Непадалёку ад дворыка стаяла цагляная калона з фігурай святога Рафала. Калона тая без фігуры захавалася да апошняга часу...»*

Менавіта тут, непадалёку ад калоны Рафала, якая нейкім цудам ацалела да нашага часу, у даўно зменөнай мясцовасці ў сціплым будынку нарадзіўся і вырас Юльян Урсын Нямцэвіч, а сведцы гэтага, які добра памятае Юльяна, прыкладна 250 гадоў. Узрост паважны.

Што дапамагло гэтай калоне ў гістарычнай кругаверці выстаяць, сказаць цяжка, але скідваць з разліку яе «святасць» не будзем. Хто ж такі Рахвал, ці дакладней Рафаіл? У сусветнай паслябіблейскай міфалогіі гэта адзін з сямі вялікіх анёлаў-архангелаў. Апакрыфічная кніга Еноха прызнае яго другім пасля Міхаіла. У некананічнай кнізе Товіта ён выступае ў ролі анёла-цаліцеля, якога паслаў Бог, каб вярнуць Товіту зрок і пазбавіць ад злых духаў. Разам з гэтым Рафаіл выступае нараўне з другімі архангеламі ў функцыі асветніка і вучыць Ноя распазнаваць лекавыя травы, перадае Адаму кнігі тайных ведаў, а ў «Загубленым раі» Дж. Мільтана ён прадстае настаўнікам Адама і Евы. Што тут разважаць: Марцэль добра ведаў, каго ўзнесці на высокую цагляную калону , а сродкаў на гэтыя справы ён не шкадаваў. Да таго ж дакладны пераклад імя Рафаіла з яўрэйскай мовы гучыць як «Ісцэлі, Божа!».А сям'я ў Марцэля была шматдзетнай: ягоная жонка Ядвіга з Сухадольскіх нарадзіла ні больш ні менш як пятнаццаць дзяцей і толькі палова з іх не памерла ў дзіцячым узросце. Таму і зварот Марцэля да архангела Рафаіла добра зразумелы.

І заключны акорд гучыць ад самога Юльяна Урсын Нямцэвіча. Як напісаў ён у першым томе сваіх "Дзённікаў часоў маіх" на старонцы трыццаць пятай, дзе прыводзіць дэталёвае апісанне таго бацькоўскага драўлянага дома, у якім ён сам нарадзіўся і вырас : *"W innym miejscu postawił mój ojciec pałac murowany"*— пераклад не патрабуецца , усё зразумела. Такім чынам высвятляецца, што пад Брэстам, акрамя вядомага палаца, існуе другі цікавы гістарычны аб'ект, які мае прамое дачыненне да спадчыны Нямцэвічаў і да якога усім нам з павагай трэба паставіцца. І так многа чаго змарнавалі. Нямцэвічы – гэта цэлы гістарычны пласт нашай спадчыны і, натуральна, для захавання яго патрабуюцца зусім другія, менавіта, дзяржаўныя падыходы.

Літаратура


1. Гладышчук А.А. Цагляная калона ў аколіцах Скокаў (Брэсцкі раён) – выдатны помнік эпохі Асветніцтва // Вестник БГТУ. Брэст. № 6, 2002.
2. Несцярчук Л.М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X-XX стагоддзяў. – Мн.: «Белта», 2002. – С.54.
3. Кулагін А. Сядзіба Скокі. Юльян Урсын Нямцэвіч. – Мн, Роднае слова. № 12, 2000, С.86-90.
4. Niemcewicz S.U. Moim wnukom. Manuskrypt, 1975, s.44.
5. Niemcewicz J.U.Pamiętniki czasów moich. – Warszawa: Państwowy Instytut Wydawniczy,1957. – T.1. – S.35.


**Prominent Skoki Heritage of the Niemcewiches**


A. Gladyshchuk

Brest State Technical University, Belarus



*The family of Niemcewich played an important role in the history and culture of the Republic of Belarus. Their cultural heritage must be restored and preserved. The article establishes some interesting facts about the history of the Niemcewiches' palace in Skoki, for example, a purpose of the brick column near Skoki, and a place where there could be a wooden house, a birthplace of Julian Ursin Niemcewich. A famous statesman, historian and poet, he is also known for being Kosciusko' comrade in arms.*